## 36,6°

# «ВЫМЫЙЦЕ» ПІЕЛАНЕФРЫТ З НЫРАК

**Найбольш частае захворванне нырак — піеланефрыт. Медыкі адзначаюць, што мужчыны пакутуюць ад яго, галоўным чынам, у пажылым узросце, а жанчыны — у маладосці ў сувязі з пачаткам палавога жыцця, з цяжарнасцю або родамі.**

Піеланефрыт — інфекцыйна-запаленчы працэс, які пашкоджвае тканку ныркі. Хваробатворныя мікробы пранікаюць у нырачную тканку як «узыходным» шляхам па мачаточніку з мочаспускальнага канала, мачавога пухіра (пры цыстыце, урэтрыце), так і праз кроў з іншых ачагоў інфекцыі ў арганізме, напрыклад з насаглоткі (пры ангіне), поласці рота (пры карыесе). Але наяўнасць інфекцыі — не адзіная ўмова для ўзнікнення хваробы. Другая прычына з'яўлення піеланефрыту — ускладнены адток мачы (пры мочакаменнай хваробе, адэноме прастаты, цяжарнасці ў жанчын, анамальных змяненнях нырак і інш.). Садзейнічаюць развіццю захворвання гіпавітаміноз, цукровы дыябет, пераахаладжэнне, зніжэнне імунітэту, стомленасць.

Востры піеланефрыт праяўляецца раптоўна: павышаецца тэмпература цела (да 38—40 °С), з'яўляюцца дрыжыкі, моцнае потавыдзяленне, болі ў паяснічнай вобласці, мутная мача, млоснасць і рвота. Хранічны піеланефрыт, як правіла, вынік недалечанага вострага працэсу. Ён можа працякаць бессімптомна, а можа непакоіць чалавека тупымі ныючымі болямі ў паясніцы (асабліва ў сырое халоднае надвор'е), частымі позывамі на мочаспусканне, перыядычнымі «беспрычыннымі» павышэннем тэмпературы, патлівасцю па начах.

Хворыя з вострай формай піеланефрыту абавязкова павінны лячыцца ў стацыянары. Акрамя актыўнай антыбактэрыяльнай тэрапіі, ім неабходны пасцельны рэжым. У цяпле, спакоі і гарызантальным становішчы ныркі лепш забяспечваюцца крывёю, лягчэй фільтруюць яе. Лячэнне праводзіцца да таго часу, пакуль з мачы хворага цалкам не знікнуць мікробы.

Каб не даць бактэрыям «атабарыцца і размнажацца» ў нырках, «вымывайце» іх. Для гэтага штодзень неабходна выпіваць каля 2 л вадкасці. Як мага часцей піце журавінавы або іншыя кіслыя сокі, багатыя на вітамін С. Апошні падкісляе мачу, што ўскладняе рост бактэрый.

Для хутчэйшага выздараўлення ўрачы раяць зрабіць на паяснічную вобласць чысташарсцяны пояс або проста абвязацца пуховай хусткай. Насіць іх трэба пастаянна, не здымаючы ні днём, ні ноччу.

Разам з медыкаментознымі і фізіятэрапеўтычнымі метадамі хворым на піеланефрыт прызначаюць зборы лекавых раслін. У зборах гаючыя ўласцівасці кожнай з раслін шматразова павялічваюцца за кошт эфекту напаўнення. Фітатэрапія прымяняецца не толькі на этапе абвастрэння захворвання, але і як спосаб прафілактыкі.

- 1 ст. лыжку сумесі лісця і каранёў крапівы і каранёў лакрычніку настояць 1—2 гадзіны ў 2 шклянках кіпеню, піць па 1 шк. раніцай і вечарам.
- Змяшаць роўнымі часткамі корань акопніку, траву зверабою, траву фіялкі, траву сардэчніку. Заварыць 1 шклянкай кіпеню 10 г сумесі, вытрымаць 10 хвілін на вадзяной лазні і настояць 30 хвілін. Прымаць па 1/3 шклянкі 3 разы на дзень.
- Змяшаць роўнымі часткамі зверабой, крапіву, брусънічнік, цвінтарэй, шыпшыну. 1 ст. лыжку збору заліць 0,5 л кіпеню і настояць паўгадзіны, піць па 100—150 мл у суткі.
- Трава цвінтарэю (20 г), корань цыкорыі дзікай (20 г), шышкі хмелю (15 г), трава зарніцы (10 г), насенне каляндры (5 г). 1 ст. лыжку сумесі заварваюць у шклянцы кіпеню. П'юць па паўшклянкі пасля вячэры.
- Насенне лёну (50 г), лісце бярозы (30 г), лісце крапівы (20 г), лісце суніцы (10 г). 2 ст. лыжкі збору заліць кіпенем, настой прымаць у цёплым выглядзе на працягу дня.
- Узяць лісце бярозы, ягады ядлоўцу, траву нырачнага чаю і спарышу ў суадносінах 1:1:1:2, заварыць 1 ст. лыжку сумесі шклянкай кіпеню ў тэрмасе на 30 хвілін.

Памятайце, што працяглы прыём настояў і адвараў лекавых раслін выклікае павышанае мочааддзяленне, пры гэтым з мачой выводзіцца вялікая колькасць вельмі патрэбнага арганізму калію. Таму для яго папаўнення ў меню неабходна ўключаць абрыкосы, курагу, разынкі, парэчкі, пятрушку.

Хворыя на піеланефрыт павінны прытрымлівацца дыеты. Ім рэкамендаваны стравы з агародніны, садавіны (бульба, морква, капуста, буракі, яблыкі, слівы, інжыр), кісламалочныя прадукты, яйкі, адвараныя мяса і рыба. Абмяжоўваецца прыём вострых, салёных, вэнджаных страў і алкаголю. Каб стварыць у нырках неспрыяльныя ўмовы для мікраарганізмаў, паспрабуйце 2—3 дні ўжываць пераважна падкісляльныя прадукты (хлеб, мучныя вырабы, мяса, яйкі), затым 2—3 дні — прадукты, якія падшчалочваюць мачу (агародніна, садавіна, малако). Урологі раяць уключаць у рацыён баклажаны, гарбузы, дыні, кавуны, якія валодаюць мачагонным дзеяннем і садзейнічаюць ачышчэнню мачавых шляхоў ад мікробаў, слізі, дробных каменьчыкаў. Чарніцы, журавіны і брусніцы — увогуле карысныя ва ўсіх відах. Свежыя або замарожаныя, у морсе ці ў кампоце, яны змяншаюць запаленчыя з'явы і забяспечваюць арганізм вітамінамі.

**Падрыхтавала Вольга ЦЫБУЛЬСКАЯ.**

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.



Ва урочышчы Вараб'ёвы Горы ля горада Гарадок Віцебскай вобласці праходзіць спартыўна-турыстычны злёт моладзі Саюзнай дзяржавы, на які прыехалі больш за 400 юнакоў і дзяўчат з самых розных куточкаў Беларусі і Расіі.

## Закон Рэспублікі Беларусь

# АБ УНЯСЕННІ ДАПАЎНЕННЯ Ў ЗАКОН РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ «АБ УНЯСЕННІ ЗМЯНЕННЯЎ І ДАПАЎНЕННЯЎ У ВОДНЫ КОДЭКС РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ»

*Прыняты Палатай прадстаўнікоў 4 чэрвеня 2008 года*
*Адобраны Саветам Рэспублікі 20 чэрвеня 2008 года*

**Артыкул 1.** Дапоўніць артыкул 1 Закона Рэспублікі Беларусь ад 29 снежня 2007 года «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Водны кодэкс Рэспублікі Беларусь» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2008 г., № 17, 2/1421) пунктам 61 наступнага зместу:

«61. Артыкул 77 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

**«Артыкул 77. Забароны і абмежаванні гаспадарчай і іншай дзейнасці ў водаахоўных зонах і прыбярэжных палосах**

У межах водаахоўных зонаў забараняюцца:

прымяненні хімічных сродкаў абароны раслін, унясенні мінеральных угнаенняў авіяцыйным метадам;

размяшчэнне складоў для захоўвання хімічных сродкаў абароны раслін, мінеральных угнаенняў, пляцовак для запраўкі апаратуры хімічнымі сродкамі абароны раслін, размяшчэнне аб'ектаў захоўвання нафты і нафтапрадуктаў (за выключэннем складоў нафтапрадуктаў, якія належаць арганізацыям унутранага воднага транспарту), арганізацыя летніх лагераў для сельскагаспадарчых жывёл, размяшчэнне жывёлагадоўчых фермаў і комплексаў, накапляльнікаў сцёкавых водаў, палёў арашэння сцёкавымі водамі, могілак, жывёльных могільнікаў, а таксама іншых аб'ектаў, здольных выклікаць хімічнае або біялагічнае забруджванне паверхневых і падземных водаў, што ствараюць пагрозу для жыцця і здароўя насельніцтва, якія парушаюць іншыя патрабаванні экалагічнай бяспекі;

устройства аб'ектаў пахавання і захоўвання адходаў, за выключэннем санкцыянаваных месцаў часовага захоўвання адходаў;

высечка лесу, выдаленне аб'ектаў расліннага свету без лесаўпарадкавальных праектаў, праектаў добраўпарадкавання і азелянення, па якіх атрымана станоўчае заключэнне дзяржаўнай экалагічнай экспертызы, за выключэннем выпадкаў, прадугледжаных заканадаўствам Рэспублікі Беларусь аб выкарыстанні, ахове і абароне лясоў, аб ахове і выкарыстанні расліннага свету, аб транспарце, аб Дзяржаўнай граніцы Рэспублікі Беларусь;

мыйка транспартных і іншых тэхнічных сродкаў па-за ўстаноўленымі месцамі;

стаянка механічных транспартных сродкаў, за выключэннем спецыяльна адведзеных ва ўстаноўленым парадку месцаў для стаянак механічных транспартных сродкаў, а ў выпадку іх адсутнасці — на адлегласці не менш чым трыццаць метраў па гарызанталі ад уразання вады.

Размяшчэнне садаводчых таварыстваў, дачных кааператываў у межах водаахоўных зонаў дапускаецца пры ўмове ўзгаднення праектаў арганізацыі і забудовы тэрыторый садаводчых таварыстваў, дачных кааператываў у адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь аб ахове і выкарыстанні зямель, аб будаўніцтве, архітэктуры і горадабудаўніцтве, аб ахове навакольнага асяроддзя.

У межах прыбярэжных палос дзейнічаюць забароны і абмежаванні, указаныя ў частцы першай гэтага артыкула, а таксама забараняюцца:

будаўніцтва і рэканструкцыя будынкаў і збудаванняў, правядзенне іншых работ, за выключэннем указаных у частках чацвёртай—шостай гэтага артыкула;

прымяненне ўсіх відаў угнаенняў на адлегласці да дзесяці метраў па гарызанталі ад уразання вады;

выпас сельскагаспадарчых жывёл па-за ўстаноўленымі мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі месцаў;

апрацоўка, узворванне зямель (глебы) на адлегласці да дзесяці метраў па гарызанталі ад уразання вады, за выключэннем апрацоўкі зямель (глебы) для залужэння і пасадкі водаахоўных і ахоўных лясоў, а таксама пры правядзенні работ, указаных у частках чацвёртай—шостай гэтага артыкула;

выдаленне аб'ектаў расліннага свету, за выключэннем іх выдалення пры правядзенні работ па ўстаноўцы і падтрыманні ў спраўным стане пагранічных знакаў, знакаў берагавога навігацыйнага становішча і ўзвядзення водных шляхоў, палос адвядзення аўтамабільных дарог і чыгунак, іншых транспартных і камунікацыйных ліній, а таксама пры правядзенні работ, указаных у частках чацвёртай—шостай гэтага артыкула або вызначаных іншымі заканадаўчымі актамі Рэспублікі Беларусь;

загароджванне зямельных участкаў на адлегласці менш чым пяць метраў па гарызанталі ад уразання вады, за выключэннем зямельных участкаў, прадастаўленых для будаўніцтва і абслугоўвання водазаборных збудаванняў, аб'ектаў унутранага воднага транспарту, энергетыкі, рыбаводных гаспадарак, рэкрэацыйнага і лячэбна-аздараўленчага прызначэння і іншых аб'ектаў, эксплуатацыя якіх непасрэдна звязана з выкарыстаннем водных аб'ектаў;

размяшчэнне лодачных прычалаў і пляцовак пастаяннага базіравання маламерных суднаў за межамі адведзеных для гэтых мэтаў месцаў, якія вызначаюцца мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі;

размяшчэнне збудаванняў для ачысткі сцёкавых водаў (за выключэннем збудаванняў для ачысткі дажджавых водаў) і апрацоўкі асадку сцёкавых водаў;

размяшчэнне садаводчых таварыстваў і дачных кааператываў;

тэхнічнае абслугоўванне транспартных і іншых тэхнічных сродкаў.

У межах прыбярэжных палос дапускаюцца будаўніцтва і рэканструкцыя:

дамоў адпачынку, санаторыяў, санаторыяў-прафілакторыяў, дамоў паляўнічага і рыбалова, дзіцячых аздараўленчых лагераў, спартыўных і турыстычных комплексаў, у тым ліку для агра- і экатурызму;

збудаванняў выратавальных станцый Рэспубліканскага дзяржаўна-грамадскага аб'яднання «Беларускае рэспубліканскае таварыства ратавання на водах»;

збудаванняў, прызначаных для добраўпарадкавання пляжаў і іншых зонаў адпачынку (біятуалеты, масткі для купання і лоўлі рыбы, ценявыя навесы і да іх падобныя аб'екты);

малых архітэктурных формаў (альтанкі, навесы, арэлі і да іх падобныя аб'екты, прызначаныя для добраўпарадкавання прыбярэжных палос водных аб'ектаў), а таксама размяшчэнне кантэйнераў, сметніц для збору адходаў;

збудаванняў для захоўвання маламерных суднаў і іншых плавальных сродкаў;

аб'ектаў, звязаных з дзейнасцю ўнутранага воднага транспарту;

маставых пераходаў;

гідратэхнічных збудаванняў, у тым ліку водазаборных і водарэгулюемых збудаванняў, а таксама гідраэнергетычных збудаванняў, дзюкераў, аб'ектаў інжынернай інфраструктуры;

збудаванняў і аб'ектаў, неабходных для ажыццяўлення аховы Дзяржаўнай граніцы Рэспублікі Беларусь, у межах пагранічнай паласы;

пунктаў гідраметэаралагічных назіранняў;

іншых аб'ектаў, якія вызначаюцца Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь па ўзгадненні з Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

У межах прыбярэжных палос дапускаюцца будаўніцтва, рэканструкцыя і эксплуатацыя жылых дамоў, будынкаў і збудаванняў пры іх, у тым ліку памяшканняў для захоўвання інвентару, цвёрдага паліва, гаражоў для захоўвання легкавых аўтамабіляў і матацыклаў, туалетаў з абсталяваным адводам сцёкавых водаў у цэнтралізаваныя сістэмы каналізацыі ці воданепранікальныя сметнікі з арганізаваным пад'ездам для вывазу сцёкаў, на зямельных участках, прадастаўленых у адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь аб ахове і выкарыстанні зямель да 24 ліпеня 2008 года, калі такое будаўніцтва, рэканструкцыя і эксплуатацыя адпавядаюць патрабаванням заканадаўства Рэспублікі Беларусь аб будаўніцтве, архітэктуры і горадабудаўніцтве, аб ахове навакольнага асяроддзя, аб санітарна-эпідэмічным дабрабыце насельніцтва і выконваюцца інтарэсы дзяржавы і законныя інтарэсы грамадзян.

Акрамя будаўніцтва і рэканструкцыі аб'ектаў, указаных у частках чацвёртай і пятай гэтага артыкула, у межах прыбярэжных палос дапускаюцца размяшчэнне пасек без капітальных будынкаў, а таксама правядзенне:

работ, звязаных з умацаваннем берагоў водных аб'ектаў;

работ па ўтрыманні і тэхнічным абслугоўванні існуючай забудовы;

работ па вядзенні садаводства і агародніцтва на зямельных участках, што знаходзяцца ў карыстанні, пажыццёвым валоданні, атрыманым у спадчыну, прыватнай уласнасці або арэндзе грамадзян, на землях населеных пунктаў, садаводчых таварыстваў і дачных кааператываў;

рамонтных і эксплуатацыйных работ па ўтрыманні гідратэхнічных збудаванняў, у тым ліку водазаборных і водарэгулюемых збудаванняў, а таксама гідраэнергетычных збудаванняў, мастоў і ўнутраных водных шляхоў;

іншых відаў работ, якія вызначаюцца Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь па ўзгадненні з Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

У межах прыбярэжных палос эксплуатацыя будынкаў і збудаванняў, узведзеных да 24 ліпеня 2008 года, якія маюць скід сцёкавых водаў, ажыццяўляецца пры наяўнасці цэнтралізаванай сістэмы каналізацыі, адводу і ачысткі забруджаных сцёкавых водаў або ўстройства воданепранікальных сметнікаў з арганізаваным пад'ездам для вывазу сцёкаў. Выбар месца для ўладкавання воданепранікальнага сметніка робіцца на максімальна аддаленай адлегласці ад уразання вады воднага аб'екта ў межах прадастаўленага зямельнага ўчастка па ўзгадненні з органамі дзяржаўнага санітарнага нагляду.

Заканадаўчымі актамі Рэспублікі Беларусь могуць быць устаноўлены і іншыя забароны і абмежаванні гаспадарчай і іншай дзейнасці ў водаахоўных зонах і прыбярэжных палосах.».

**Артыкул 2.** Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь да 24 ліпеня 2008 года:

прывесці нарматыўныя прававыя акты Ўрада Рэспублікі Беларусь у адпаведнасць з гэтым Законам;

забяспечыць прывядзенне рэспубліканскімі органамі дзяржаўнага кіравання, падпарадкаванымі Ўраду Рэспублікі Беларусь, іх нарматыўных прававых актаў у адпаведнасць з гэтым Законам;

прыняць іншыя меры, неабходныя для рэалізацыі палажэнняў гэтага Закона.

Мясцовым выканаўчым і распарадчым органам да 24 ліпеня 2008 года прывесці свае нарматыўныя прававыя акты ў адпаведнасць з гэтым Законам.

**Артыкул 3.** Гэты Закон уступае ў сілу з 24 ліпеня 2008 года, за выключэннем гэтага артыкула і артыкула 2, якія ўступаюць у сілу з дня афіцыйнага апублікавання гэтага Закона.

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А. Лукашэнка**

*8 ліпеня 2008 года, г. Мінск.*
*№ 374—З*

## Здароўе нацыі

# За сэрца і сасуды — усёй папуляцыяй

**У краіне пакрысе зніжаецца смяротнасць ад хваробаў сардэчна-сасудзістай сістэмы. Так, у 2006 годзе гэты паказчык складаў 55,5 працэнта ў структуры прычын смерці беларусаў, у 2007-м — 54,1, а ў першым паўгоддзі гэтага года — 52,5.**

Паводле слоў галоўнага ўрача Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра «Кардыялогія» Аляксандра МРОЧАКА, падобная пазітыўная тэндэнцыя намецілася ў рэспубліцы ўпершыню. Разам з тым у Беларусі яшчэ застаюцца рэгіёны, у якіх сардэчна-сасудзістая паталогія ўсё часцей скарачае жыццё тым, хто ад яе пакутуе. Абумоўлена гэта шэрагам прычын.

Адразу варта заўважыць, што айчынная кардыяслужба на сёння добра арганізавана і развіта. Іншая справа, што некаторым заможным дзяржавам свету ўдалося дабіцца пэўных поспехаў у зніжэнні смяротнасці ад сардэчна-сасудзістых хвароб дзякуючы не столькі развіццю медыцынскай дапамогі, колькі ўкараненню масавай, папуляцыйнай стратэгіі прафілактыкі. Як адзначае спадар Мрочак, прафілактыка ў дадзеным выпадку — гэта не проста абвяшчэнне ісціны аб тым, што курыць шкодна. Дзейснасць гэтай самай прафілактыкі праявіцца ў маштабе крокаў. Скажам, колькі краін дзяржаўнай воляй літаральна насадзілі сваім грамадзянам неабходнасць адмаўлення ад шкоднай звычкі, так што цяпер курца, які нахабна закурыць нават на гарадской вуліцы, там, мякка кажучы, ніхто не адобрыць... Аднак некурэнне — толькі адзін з фактараў прафілактыкі праблем з сэрцам і сасудамі. Вядома, якую шкоду прыносяць апошнім злоўжыванне тым жа алкаголем, а таксама прадуктамі, багатымі на халестэрын. Вось у Францыі, напрыклад, прафілактыка пайшла нетрадыцыйным шляхам. Там вырашана прыпыніць «змаганне» з дарослымі, якія цяжка і, як правіла, безвынікова развітваюцца са стэрэатыпамі, а замест гэтага звярнуцца да... будучых дарослых. І вось ужо сучасныя малыя французы маюць рэальную магчымасць значна больш ведаць аб халестэрыне, чым іх бацькі! Дзякуй спецыяльнай дзіцячай літаратуры. І правільна: мала таго, што дзіця вучыцца рабіць правільны жыццёвы выбар, дык яно яшчэ і наставіць пры неабходнасці на правільны шлях сваіх бацькоў.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

## У ТУРМУ — НАДОЎГА

**Гэтае небяспечнае злачынства было ўчынена ў 2005 годзе, і доўгі час яго не ўдавалася раскрыць. Тады сярод белага дня на дарозе была абстраляная аўтамашына, на якой везлі месячную зарплату работнікам Гомельскага горнаўзбагачальнага камбіната. Шэсць узброеных злачынцаў з маскамі на твары зніклі з месца здарэння з больш як 109 мільёнамі рублёў.**

Да пошукаў іх гомельскія сышчыкі падключылі сваіх калег з суседняй расійскай Браншчыны, і тыя амаль праз год затрымалі двух украінцаў, якія спрабавалі перайсці мяжу паміж Расіяй і Ўкраінай з мяшком, у якім знаходзіліся часткі аўтамата Калашнікава і вінчэстэр. Пачалося следства, якое закончылася летась, і ў якое ўключыліся органы правапарадку Ўкраіны. А затым адбыўся суд. У выніку двое злачынцаў правядуць па некалькі гадоў у расійскіх турмах, адзін (таксама ўкраінец) — ва ўкраінскай. А калі яны там адбудуць пакаранне, іх даставяць у беларускую турму: аднаго на 11 гадоў і двух — на 9. Траіх жа іх саўдзельнікаў таго злачынства дагэтуль знайсці не ўдалося.

## МІЛЬЁНЫ ДЛЯ ІЛЖЭПРАДПРЫМАЛЬНІКАЎ

**У першым выпадку яны склалі 31 мільён рублёў. Такі даход атрымаў ад незаконнай дзейнасці адзін жыхар Гомеля, які на працягу двух апошніх гадоў у розніцу прадаваў этылавы спірт, не маючы на гэта ліцэнзіі.**

А ў другім — 618 мільёнаў рублёў. Столькі ў свае кішэні паклалі тры мужыкі, якія, зарэгістраваўшы ў Гомелі фірму, выйшлі за рамкі яе статута і займаліся будаўніча-мантажнымі работамі на тэрыторыі рэспублікі. Крымінальныя справы па гэтых фактах узбуджаны пасля праверак, якія зрабілі супрацоўнікі ўпраўлення дэпартамента фінансавых расследаванняў дзяржкамітэта краіны па Гомельскай вобласці сумесна з органамі барацьбы з эканамічнымі злачынствамі.

**Уладзімір ПЕРНІКАЎ.**

## ТАКІ ЎНУК

Жыхар Брэста заявіў у міліцыю, што з гаража нехта ўкраў машыну. Праз нейкі час аўтамабіль знайшлі каля аднаго з дамоў па вул. Вясёлкавай. А следства ўстанавіла, што замок з гаража сарваў і выкраў машыну родны ўнук заяўніка — вучань сярэдняй школы.

## І ТАКІЯ СЫНЫ

У бальніцу з цяжкімі траўмамі галавы трапіў пенсіянер з в. Дамашыцы (Пінскі раён). Устаноўлена, што яго пакалечылі сыны. Аднаго затрымалі, другога шукаюць.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**


## МОГИЛЕВСКИЙ ГОРИСПОЛКОМ СООБЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА НА ПРАВО ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРА АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНОГО УЧАСТКА В г. МОГИЛЕВЕ

**Аукцион состоится 19 августа 2008 года в 15.00 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 28а, зал заседаний**

| Адрес земельного участка, площадь | Срок аренды | Цель использования | Кадастровый номер | Начальная цена (руб.) | Сумма задатка (руб.) | Характеристика земельного участка |
|---|---|---|---|---|---|---|
| ул. Андреева 0,0110 га с ограничением в использовании на площади 0,0110 га (водоохранная зона р. Днепр) | 10 лет | строительство и обслуживание базовой станции сотовой связи | 740100000006002252 | 821 000 | 80 000 | Земельный участок свободен от застройки |

Условия продажи:

1. Возмещение расходов связанных с подготовкой и проведением аукциона, подготовкой документации, необходимой для его проведения.

2. В течение 10-и рабочих дней со дня принятия решения о передаче победителю аукциона в аренду земельного участка оплатить стоимость предмета аукциона.

3. В течение 2-х рабочих дней после внесения платы за предмет аукциона и возмещения затрат, связанных с подготовкой и проведением аукциона, подготовкой документации, необходимой для его проведения, заключить с Могилевским городским исполнительным комитетом договор аренды земельного участка.

**ПРИМЕЧАНИЕ:** Заявления и документы принимаются уполномоченной организацией (МГУКПП «Центр по землеустройству») по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 28а, каб. 206 в рабочие дни с 08.00 до 17.00. Последний день приема заявлений – **13.08.2008** года до 17.00. Заключительная регистрация участников аукциона – **19.08.2008** года с 14.20 до 14.50 в каб. 206.

1. Для участия в аукционе необходимо в срок, указанный в извещении подписать соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона и предоставить в уполномоченную организацию следующие документы:

- заявление на участие в аукционе;
- заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка на расчетный счет Могилевского городского исполнительного комитета № 3642017441709 в филиале 700 МОУ ОАО «АСБ «Беларусбанк», код 536, УНП 700123787;
- копию документа, содержащего идентификационные сведения (для физических лиц);
- доверенность, удостоверенную нотариально, если в аукционе участвует представитель физического лица, паспорт;
- документ, подтверждающий полномочия представителя юридического лица;
- копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации юридического лица, индивидуального предпринимателя.

2. Всем желающим предоставляется возможность предварительного ознакомления с предметом аукциона.

**Контактный телефон в г. Могилеве 22 11 63**

УНП 700008723



## Могилевский городской исполнительный комитет сообщает о проведении открытого аукциона по продаже земельных участков в частную собственность, который состоится 19 августа 2008 года

в **16.00** по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 28а, зал заседаний. Заявления и документы принимаются уполномоченной организацией (МГУКПП «Центр по землеустройству») по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 28а, каб. 206 в рабочие дни с 08.00 до 17.00. Последний день приема заявлений – **13.08.2008** года до 17.00. Заключительная регистрация участников аукциона – **19.08.2008** года с 15.20 до 15.50 в каб. 206.

Продажа земельных участков производится гражданам Республики Беларусь.

Для участия в аукционе необходимо в сроки, указанные в извещении предоставить в уполномоченную организацию следующие документы: а) заявление на участие; б) заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка на расчетный счет Могилевского городского исполнительного комитета № 3642017441709 в филиале 700 МОУ ОАО «АСБ «Беларусбанк», код 536, УНП 700123787; в) документ, удостоверяющий личность (паспорт) покупателя или его доверенного лица; г) доверенность, удостоверенную нотариально, если в аукционе участвует представитель физического лица.

Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену.

Победитель аукциона обязан: оплатить в течение десяти рабочих дней после принятия решения о предоставлении земельного участка в частную собственность стоимость объекта аукциона; возместить затраты, связанные с подготовкой аукциона и документацией, необходимой для его проведения.

Всем желающим предоставляется возможность предварительного ознакомления с объектами.

Продажа земельных участков производится без изменения их целевого назначения.

Покупатель, желающий участвовать в торгах по нескольким лотам, вносит задаток в размере 10 % от начальной цены земельного участка с наибольшей стоимостью.

| № лота | Адрес земельного участка | Площадь, га | Кадастровый номер | Начальная цена (руб.) | Сумма задатка (руб.) |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | пер. 4-й Павлова, 1 | 0.1388 га | 740100000007004456 | 6 080 000 | 608 000 |
| 2 | пер. 4-й Павлова, 3 | 0.1006 га | 740100000007004458 | 5 334 000 | 533 000 |
| 3 | пер. 4-й Павлова, 5 | 0.1006 га | 740100000007004460 | 5 334 000 | 533 000 |
| 4 | пер. 4-й Павлова, 7 | 0.1006 га | 740100000007004462 | 5 334 000 | 533 000 |
| 5 | пер. 5-й Павлова, 2 | 0.1071 га | 740100000007004434 | 4 236 000 | 424 000 |
| 6 | пер. 5-й Павлова, 4 | 0.1006 га | 740100000007004439 | 5 334 000 | 534 000 |
| 7 | пер. 5-й Павлова, 6 | 0.1007 га | 740100000007004419 | 5 340 000 | 534 000 |
| 8 | пер. 5-й Павлова, 8 | 0.1006 га | 740100000007004446 | 5 334 000 | 533 000 |

Строений, сооружений и инженерных коммуникаций на земельных участках нет. Грунты подходят для малоэтажной застройки.

**Контактный телефон в г. Могилеве 22 11 63**

УНП 700008723



## ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ

**на право заключения договора аренды земельного участка для размещения объекта строительства**

| | |
|---|---|
| **Наименование предмета аукциона** | **Право заключения договора аренды земельного участка под строительство охотничье-рыболовных домиков на 18 мест** |
| **Арендодатель земельного участка** | Ивановский районный исполнительный комитет, Брестская область, г. Иваново, пл. Октября, д. 2 Тел. 8(01652) 2 13 69 |
| **Адрес земельного участка/ кадастровый номер** | Брестская область, Ивановский район, Мотольский с/с, 5,2 км северо-западнее дер. Мотоль (восточный берег водохранилища «Жидинье»)/ № 123084505601001120 |
| **Размер (площадь) земельного участка, га** | 0,6240 |
| **Срок аренды земельного участка, лет** | 50 |
| **Целевое назначение земельного участка** | под строительство охотничье-рыболовных домиков на 18 мест |
| **Характеристика расположенных на участке инженерных коммуникаций и сооружений** | Участок пустует, посадка леса не производилась, граница земельного участка проходит по суходолу. Подъезд к участку будет осуществляться по существующей дорожной сети СПК «Агро-Мотоль». Установлены ограничения в использовании земельного участка в связи с его расположением в водоохранной зоне водохранилища «Жидинье» на площади 0,6240 га (Положение о порядке установления размеров и границ водоохранных зон и прибрежных полос водных объектов и режиме ведения в них хозяйственной деятельности, утв. постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 21 марта 2006 г. № 377). |
| **Условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона:** | - внесения победителем аукциона платы за право заключения договора аренды земельного участка;<br>- возмещения победителем аукциона расходов, связанных с проведением аукциона и формированием земельного участка, в том числе с государственной регистрацией в отношении создания земельного участка;<br>-заключения победителем аукциона с Ивановским райисполкомом договора аренды земельного участка и осуществления в 2-месячный срок после принятия решения райисполкома о предоставлении ему земельного участка государственной регистрации права на земельный участок;<br>- получения победителем аукциона в установленном порядке разрешения Ивановского райисполкома на проведение проектно-изыскательских работ и разработки строительного проекта на строительство объекта;<br>- осуществление строительства объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией. |
| **Начальная цена предмета аукциона, руб.** | 40 124 900 |
| **Размер задатка, руб.** | 4 012 490 |
| **Организатор аукциона** | ***Фонд «Брестоблимущество», г. Брест, ул. Ленина, д. 11 тел. (0162) 23 44 06, 23 12 63, 20 87 85 www.brest-region.by, e-mail: fond@brest-region.by*** |

Аукцион состоится **29 августа 2008 года** в 11.10 по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 11, каб. 524 (здание облисполкома).

Для участия в аукционе приглашаются юридические лица всех форм собственности и индивидуальные предприниматели. Участнику необходимо подать заявление на участие в аукционе по установленной форме и подписанное соглашение с фондом «Брестоблимущество». **Лица, желающие принять участие в аукционе, к заявлению прилагают:** заверенные банком копии платежных поручений:

- о внесении суммы задатка на р/с 3642202530011 Головной филиал по Брестской области ОАО «Белинвестбанк», код банка 823, получатель платежа – фонд «Брестоблимущество», УНН 200020538;
- о внесении специального сбора за подачу заявления на участие в аукционе в размере 4 базовых величин и платы за регистрацию участников аукциона в размере 0,5 базовой величины на р/с 3600201000015, филиал №100 ОУ ОАО «АСБ «Беларусбанк», код 246, назначение платежа 03107, УНН 200300543, получатель платежа – финансовое управление Брестского облисполкома;

индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;

представителем индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность;

представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии устава и свидетельства о государственной регистрации юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;

представителем иностранного гражданина – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе индивидуальные предприниматели, представители индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Осмотр земельных участков на местности предоставляет арендодатель.

Победитель аукциона — участник, предложивший наибольшую цену. Аукцион признается несостоявшимся, если заявление на участие подано менее чем двумя участниками, предмет аукциона не может быть продан по начальной цене.

**Участник, ставший победителем аукциона, после проведения аукциона обязан:** подписать протокол о результатах аукциона в день аукциона; в течение 10 рабочих дней со дня принятия местным исполнительным комитетом решения о предоставлении земельного участка внести плату за право заключения договора аренды земельного участка (часть платы в случае предоставления рассрочки), возместить расходы, связанные с организацией и проведением аукциона, формированием земельного участка для размещения объекта строительства, в том числе с государственной регистрацией в отношении создания земельного участка, и выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка, после чего, но не позднее 2 рабочих дней, заключить с местным исполнительным комитетом — договор аренды земельного участка.

Порядок проведения аукциона определен в соответствии с «Положением о порядке организации и проведения аукционов на право заключения договора аренды земельных участков», утвержденного Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26 марта 2008 г. № 462 с учетом требований Указа Президента Республики Беларусь от 27 декабря 2007 г. № 667 «Об изъятии и предоставлении земельных участков»

***Заявления на участие в аукционе с необходимым пакетом документов принимаются по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 11, каб. 404, 405 фонд «Брестоблимущество» с 8.30 до 13.00 с 14.00 до 17.30 по рабочим дням с 17 июля 2008 г. по 25 августа 2008 года включительно***